www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

21 чэрвеня 2005 года, № 14 (1922)

ПАДЗЕІ

## ЮБІЛЕЙ, АПАЛЕНЫ ВАЙНОЙ...

*З 24 па 29 чэрвеня 1941 года ў Беларускім дзяржаўным універсітэце павінны былі адзначаць 20-годдзе з дня заснавання. Быў запланаваны ўрачысты сход, выпрацаваны мерапрыемствы, надрукаваны запрашальныя білеты. Але святкаванне абарвала вайна...*

У памяць аб тых трагічных днях, нашых калегах, якія загінулі і якія выстаялі ў цяжкія і разам з тым гераічныя ваенныя гады, у памяць пра ўсіх, хто абараніў незалежнасць краіны, Вучоны савет БДУ запрашае студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ на пашыранае пасяджэнне Вучонага савета, прысвечанае Дню Незалежнасці Беларусі і 60-годдзю Вялікай Перамогі. Яно стане і своеасаблівым напамінам пра ўрачыстасці, якія павінны былі адбыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце 64 гады таму.

**Пасяджэнне адбудзецца ў ліцэі БДУ 29 чэрвеня ў 16.00.**

**У праграме:**

Тэатралізавана-канцэртная ўрачыстая прэзентацыя кнігі "Беларускі дзяржаўны універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945". У ёй прымуць удзел сённяшнія і былыя супрацоўнікі універсітэта, кіраўніцтва ВНУ, артысты і творчыя калектывы БДУ.

ВЫПУСКНІКІ — 2005

# ЯК СТАЦЬ НАЙЛЕПШЫМ

*Беларускі дзяржаўны універсітэт нездарма называюць рэспубліканскай кузняй спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Яго выпускнікі ідуць у навуку, працуюць на прадпрыемствах, у школах, рэдакцыях, фірмах. У гэтым годзе 1962 выпускнікі здаюць сваю апошнюю студэнцкую сесію. Напрыканцы чэрвеня іх чакае выпускны баль. А самыя лепшыя з іх будуць прадстаўляць нашу ВНУ на Рэспубліканскім балі выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў.*

*Кожны з іх ставіў перад сабой пэўныя мэты і жадаў нечага дасягнуць. Што ўдалося ўчорашнім студэнтам? Ці цяжка ім было навучацца? З якімі пачуццямі яны пакідаюць універсітэт? Пра ўсё гэта мы пацікавіліся ў выпускнікоў розных факультэтаў БДУ.*

**Вольга ЮРАЧКА, факультэт журналістыкі:**



— Мне было цяжка пачынаць вучыцца, бо я расіянка і прыехала ў Беларусь, не ведаючы беларускай мовы і літаратуры. Я не паступіла адразу на бюджэтнае навучанне, а толькі на чвэрць аплаты. Першыя два гады я ўзмоцнена вучылася, і не ведаю цяпер, як мне хапіла сіл усім гэтым займацца, каб пасля другога курса перапаступіць. А потым я ўжо вучылася для свайго задавальнення.

На факультэце багата выкладчыкаў, якія не проста выкладаюць, а з'яўляюцца настаўнікамі: яны настолькі ўмеюць завабіць сваім прадметам, што вучыш не таму, што гэта неабходна, а таму, што самому цікава.

Мне вучыцца заўжды было лёгка. Калі ў цябе

*(Заканчэнне на 2-й старонцы)*

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДЗЕНЬ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ Стар. 3

ПРЭМІІ АД ГОРАДА Стар. 3

РАЗМАЎЛЯЕМ ПА-ФРАНЦУЗСКУ Стар. 4

**На сайце «Беларускага універсітэта» (www.gazeta.bsu.by) вы можаце таксама прачытаць успаміны ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — былых выкладчыкаў БДУ.**

СУСТРЭЧЫ

# РЭКТАР РАІЦЦА З ВЫПУСКНІКАМІ

*10 чэрвеня ў "габеленавай" зале рэктарата адбылася сустрэча рэктара В.І. СТРАЖАВА з выпускнікамі БДУ апошніх гадоў, лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў і таленавітай моладзі.*



У мерапрыемстве, арганізаваным упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, прынялі ўдзел прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю П.В. Скалабан.

На сустрэчы гаворка ішла пра тое, што неабходна зрабіць, каб стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы ў БДУ для раскрыцця талентаў, развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу краіны.

Многія з былых студэнтаў ужо ў поўнай меры пачалі выкарыстоўваць атрыманыя ва універсітэце веды і навыкі, а таксама мэтанакіравана працаваць, яны маюць каштоўны вопыт і выказваюць свае думкі. Некаторыя з іх распавядалі пра вопыт замежных еўрапейскіх краін, што яны прымаюць і чаго не хапае сённяшняй вышэйшай школе. Аднак высокі ўзровень адукацыі, атрыманы падчас вучобы ў БДУ адзначылі



ўсе прысутныя маладыя спецыялісты.

**Юлія ПІМЕНАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

**Ад рэдакцыі.** Да праблем, закранутых на гэтай сустрэчы, мы мяркуем звярнуцца ў бліжэйшых нумарах газеты.

## ПАДЗЕІ

### ВЫПУСКНІКОЎ ЧАКАЕ БАЛЬ

*23 чэрвеня ў 17.30 у актавай зале ліцэя БДУ адбудзецца баль выпускнікоў.*

Праграма свята складаецца з дзвюх частак. Першая — урачыстая: студэнтам, якія скончылі універсітэт з чырвоным дыпломам БДУ, уручаць граматы. Акрамя таго, будуць выбраны "зоркі" кожнага факультэта — студэнты, якія не толькі добра вучацца, але і прымаюць актыўны ўдзел у культурным жыцці БДУ.

Другая частка свята, танцавальна-забаўляльная, адбудзецца ў дворыку ліцэя. Для выпускнікоў будуць выступаць артысты беларускай эстрады, выхаванцы студыі эстраднай песні БДУ і іншыя.

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

### СТУДЭНЦКІЯ АТРАДЫ 2005 ГОДА

*Улетку БДУ, Студэнцкі саюз нашага універсітэта, камітэт БРСМ БДУ запланавалі стварыць студатрады.*

Іх мэта — прыцягнуць моладзь да працоўнай дзейнасці і актыўнага адпачынку, далучыць да культурнай, гістарычнай спадчыны нашай краіны, да працы на карысць універсітэта. Жадаючыя могуць паўдзельнічаць у наступных відах работ:

— рамонтныя работы ў інтэрнатах студэнцкага гарадка;
— сяльгасработы (Мінская вобласць, Крупскі раён, э/б "Эса");
— выхаваўчая работа ў САК "Брыганціна";
— адрасная дапамога ветэранам Вялікай Айчыннай вайны;
— краязнаўчая экспедыцыя ў наваколле Аўгустоўскага канала;
— работа ў грамадскай прыёмнай камісіі БДУ;
— рамонт корпуса юрыдычнага факультэта;
— рэканструкцыя Аўгустоўскага канала;
— будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі (ліпень).

**Па больш падрабязную інфармацыю ахвотныя запісацца ў будатрад могуць звяртацца ў Штаб працоўных спраў камітэта БРСМ БДУ (каб. 205 галоўнага корпуса, тэл. 209 52 61).**

**Святлана ДАЛГАНЮК**

ВЫПУСКНІКІ — 2005

# ЯК СТАЦЬ НАЙЛЕПШЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы)*

ёсць мэта, то яе дасягнеш. Тое ж і з працай. Яна можа быць цяжкай, але калі яна цікавая, ты справішся. Мне стала цяжка, калі пачала працаваць. Праца журналіста не абмяжоўваецца часавымі рамкамі, і мне дапамагло кіраўніцтва факультэта, прадаставіўшы вольнае наведванне лекцый. Некаторыя выкладчыкі вельмі сур'ёзна ставіліся да наведвання, але мне трэба было трымаць тэмп.

### Мікалай АКСЮТЧЫК, факультэт міжнародных адносін:



— Пры жаданні ва універсітэце ты можаш узяць усе неабходныя тэарэтычныя веды, каб паспяхова працаваць у той сферы, якую выбраў. Напэўна, позна вызначацца са спецыяльнасцю на першым курсе. Вызначыцца трэба загадзя і зразумець, ці зможаш ты гэтым займацца. Калі чалавек робіць нешта з-пад палкі (нехта параіў альбо гэта прэстыжна), эфект зусім не той. Я, напрыклад, смела магу сказаць, што з восьмага класа ўжо ведаў, куды пайду вучыцца. Адразу я не паступіў і год займаўся на падрыхтоўчым аддзяленні, а потым паспяхова здаў уступныя экзамены. Калі ёсць мэта і ты адчуваеш, што гэта — тваё, то трэба ніколі не адступаць і трымацца свайго курсу.

Былі падчас навучання выкладчыкі, якія, самі таго не ведаючы, перакваліфікавалі мяне. Спярша мне больш падабалася публічная сфера, кшталту крымінальнага права, але на другім курсе, калі ў нас пачалося грамадзянскае права, выкладчыца раскрыла гэты прадмет так, што літаральна перакanала мяне ў іншым выбары. І я змяніў спецыялізацыю.

### Юлія ПУЛКО, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:



— Я скончыла звычайную агульнаадукацыйную школу. Калі прыйшла ўпершыню на лекцыі, мне стала страшна: баялася, што не "пацягну" ўсё гэта. Потым уцягнулася, стала цікава, і ўсё пайшло лёгка. На першым курсе кожнаму трэба зразумець, ці сапраўды ты пайшоў на абраны факультэт па схільнасці, ці гэта менавіта тое, што ты хацеў. Калі выбар зроблены правільна, то з'явіцца цікавасць і поспехі.

### Надзея КАСАБУЦКАЯ, хімічны факультэт:

— Не магу сказаць, што мне было цяжка вучыцца. Хутчэй — цікава.

У мяне была добрая база пасля ліцэя, і на першым курсе я спярша расслабілася, але потым спалохалася і адразу ж узялася за вучобу. На першай сесіі ў мяне не было ніводнага канспекта, давялося прачытаць шмат кніг. Пасля гэтага я зразумела, што канспект весці значна зручней. Вядома, калі вучыцца цікава, то робіш усё з задавальненнем і з'яўляецца пэўны аўтарытэт. І працаваць на мяне ён пачаў даволі хутка — курсе на другім. Аўтарытэт



— гэта не тое, як ты працуеш на залікоўку, а тое, як ты паказваеш сябе на семінарах, заліках. Гэта стаўленне да вучобы, працы.

### Ганна АРЛОВА, гуманітарны факультэт:



— Прафесія дызайнера прадугледжвае абавязковае валоданне пэўнымі практычнымі навыкамі, якія мы можам прымяняць і ў вучобе, і на практыцы.

Я прыйшла пасля мастацкага ліцэя, і ў мяне былі ўсе навыкі тэхнічнай работы з фарбамі, макетамі, пластылінам. Некаму было цяжэй, але толькі спачатку. Потым усе зраўняліся, і ўсё залежала толькі ад самога студэнта, яго настойлівасці, жадання нешта зрабіць. Сістэма ўступнага экзамена на нашым факультэце не проста праверка тэхнікі штрыхоўкі ці ўмення маляваць роўныя лініі. Яна скіраваная на раскрыццё творчага мыслення. Са мной паступала дзяўчына з майго ліцэя і не здала іспыты, а іншая і без усялякіх навыкаў малявання выдатна справілася. Гэта своеасаблівы тэст на крэатыўнасць.

У працэсе навучання студэнты дзеляцца на тых, хто хоча атрымаць больш ведаў, і тых, хто ўжо на другім-трэцім курсе вырашыў сысці ў прафесію і менш увагі надаваць тэорыі. Я ўжо вызначылася і працую ў сферы дызайну.

### Юлія БУДНІКАВА, філалагічны факультэт:



— Напэўна, кожны першакурснік заўважаў: калі са школы, дзе ў класах шпалеры і кветкі, трапляеш у пустынныя аўдыторыі, становіцца цяжка. Потым разумееш, што гэта іншая сістэма і трэба рыхтавацца самастойна. На першым курсе было дастаткова цяжка. Я закончыла звычайную школу з эстэтычным ухілам і яшчэ ў 9-м класе вырашыла паступаць на філалагічны факультэт. Наведвала курсы пры факультэце, сама рыхтавалася і паступала туды, куды хацела. І цяпер, заканчваючы навучанне, магу сказаць, што задаволена сваім выбарам. Мае былыя аднакласнікі рабілі выбар не самастойна, а прыслухоўваліся да думкі бацькоў. І вучыліся без ахвоты. А я атрымлівала ад вучобы вялікае задавальненне. Хачу выказаць вялікую падзяку выкладчыкам. Гэта пераважна людзі творчыя і ўзнёслыя. Іх досвед і ўплыў літаратурных герояў сусветнай класікі вельмі дапамаглі мне пераацаніць многае ў жыцці. Я нават шкадую, што ўжо заканчваю навучанне.

Першакурснікам магу пажадаць нічога не баяцца, а проста быць упэўненымі ў сабе. У нервовым напружанні праходзяць першыя іспыты. Цяпер я разумею, што трэба спакайней да ўсяго ставіцца. Галоўнае — разумець, а не завучваць.

### Яна ДЗЕЯНКОВА, эканамічны факультэт:

— Мая цікавасць да вучобы шмат у чым залежала ад выкладчыкаў і прадметаў. І прафесія, і спецыяльнасць былі абраныя загадзя. Заўжды цікавіла літаратура, якую давалі чытаць дадаткова. Вучоба для мяне была мэтай, да якой я імкнулася ўсе гэтыя гады. Але былі прадметы, якія падабаліся асабліва: макраэканоміка, сусветная эканоміка.

Ва універсітэт варта ісці вучыцца, толькі калі маеш намер сапраўды вучыцца. Вучыцца трэба сур'ёзна ад самага пачатку. Можна проста рыхтавацца да сесій і здаваць іх на добрыя адзнакі, але значна лепш — разумець. Асабіста для мяне вучоба заўжды была сур'ёзнай справай.



**Гутарыла Юлія ПІМЕНАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**



СВЯТЫ

# ДЗЕНЬ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

У рамках Дзён беларускіх і ўсходнеславянскіх царкоўных дзеячаў і асветнікаў у БДУ адбылася сустрэча памяці Еўфрасінні Полацкай, на якую прыйшлі як студэнты, так і выкладчыкі універсітэта.

Мерапрыемства адбылося ў дворыку галоўнага корпуса БДУ. Пачалася святочная сустрэча харэаграфічнай кампазіцыяй у выкананні Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі. Потым выступіў рэктар БДУ, прафесар В.І. Стражаў. Ён адзначыў, што такія святы ва універсітэце будуць праводзіцца штогод, бо яны аб'ядноўваюць пакаленні. Потым слова ўзяў першы прарэктар Інстытута тэалогіі айцец Серафім, пасля якога выступіла старшыня Саюза жанчын БДУ С.Г. Савіна, якая ўзнагародзіла дыпломамі БДУ актывістак Саюза жанчын.

Працягнуў сустрэчу хор "Глорыя" пад кіраўніцтвам Алы Земчанка, які выканаў "Песнапенні". Напрыканцы свята ізноў выступіў Дзяржаўны ансамбль танца, які выканаў танец "Еўфрасіння Полацкая".

Гэтая сустрэча — чарговая з цыкла запланаваных у БДУ мерапрыемстваў, прысвечаных знакамітым дзеячам Беларусі, якія істотна паўплывалі на гісторыю і культуру нашай краіны.

**Юлія ПАПОВА**
**Фота аўтара**




АБ'ЯВЫ

## "ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

Лабараторыя эксперыментальнай фізікі высокіх энергій

навуковы супрацоўнік (1).

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31**

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

галоўнага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка) — 1;

старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.03 (радыёфізіка) — 1;

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.13.11 (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машынаў, комплексаў і камп'ютарных сетак) — 2;

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 05.13.01 (сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі) — 1.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ПРЭМІІ АД ГОРАДА

***Мінгарвыканкам у гэтым навучальным годзе ўганараваў прэміямі за актыўны ўдзел у навуковым, грамадскім і культурным жыцці сталіцы двух студэнтаў БДУ. Гэта студэнт IV курса Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы Сяргей ЮШКЕВІЧ і студэнтка V курса геаграфічнага факультэта Марыя МАНДРЫК.***



**Сяргей ЮШКЕВІЧ** — лідэр групы акцёраў студэнцкага лялечнага тэатра "Батлейка". Тэатр выступае з дабрачыннымі спектаклямі ў сацыяльных і медыцынскіх установах Мінска і Мінскай вобласці. Студэнты пабывалі ў дзіцячым апёкавым цэнтры, Беларускім дзіцячым хоспісе, дзіцячых сацыяльных прытулках і інш.

Акрамя таго, тэатр выступаў у ЗША і Германіі, дзе прадстаўляў нацыянальныя традыцыі і культуру нашага народа. Сёлета яго ўдзельнікі плануюць паехаць з цыклам спектакляў у Нідэрланды. Спектаклі "Батлейкі" маюць хрысціянска-этычную тэматыку: напрыклад, ёсць спектакль пра паслухмянасць бацькам. А да 9 мая акцёры падрыхтавалі спектакль, прысвечаны 60-годдзю Перамогі.



**Марыя МАНДРЫК** атрымала прэмію за актыўную навуковую работу. Яна падрыхтавала дыплом на тэму "Праблема дэградацыі глебаў (апустыньвання) Палесся". Ад 2003 г. дзяўчына працуе ў праблемнай НДЛ "Экалогія ландшафтаў", прымала ўдзел у шэрагу навуковых камандзіровак у Швецыю, Польшчу, Румынію. Марыя — кіраўніца беларускага філіяла Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў-геаграфаў (EGEA), мэта якога — пашыраць праўдзівую інфармацыю пра Беларусь у маладзёжных асяроддзях краінаў ЕС.

А яшчэ Марыя — старшыня Савета маладых навукоўцаў пры ГА "Беларускае геаграфічнае таварыства" і староста сваёй групы.

**Юлія ПАПОВА**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# СУМЕСНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ

Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Васіль Стражаў і Расійскага універсітэта дружбы народаў Уладзімір Філіпаў 9 чэрвеня падпісалі ў Маскве пагадненне аб супрацоўніцтве паміж ВНУ тэрмінам на 5 гадоў. Дакумент прадугледжвае абмен выкладчыкамі, навукоўцамі, супрацоўнікамі і студэнтамі двух універсітэтаў, правядзенне сумесных навуковых даследаванняў, семінараў, канферэнцый, сімпозіумаў, спрыянне ў павышэнні кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу і іншыя формы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Адным з важных пунктаў пагаднення стала дамоўленасць пра магчымасць для студэнтаў атрымліваць сумесны ці двайны дыплом па гуманітарных спецыяльнасцях. Акрамя таго, універсітэты пагадзіліся выступіць заснавальнікамі Міждзяржаўнага цэнтра падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі для дзяржаў-удзельніц СНД. Таксама была дасягнута дамоўленасць аб распрацоўцы электронных падручнікаў, сайтаў і парталаў.

**Па інфармацыі Прэс-службы БДУ**

ВЫСТАВЫ

## ХРОНІКА ВАЙНЫ

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю запрашае наведаць стэнд, прысвечаны 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: на ім будуць адлюстраваны студэнты і выкладчыкі — удзельнікі баявых дзеянняў, БДУ ў гады вайны. Стэнд будзе размешчаны 29 чэрвеня ў галоўным корпусе універсітэта на другім паверсе, каля кабінета 206.

**Святлана ДАЛГАНЮК**

ПОСТФАКТУМ

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЫЗАЙНУ

***Кафедра дызайну гуманітарнага факультэта БДУ упершыню прыняла ўдзел у штогадовай рэспубліканскай выставе "Дызайн-біржа 2005", якая праходзіла 15—17 чэрвеня.***

На выставе былі прадстаўлены арыгінальныя распрацоўкі выкладчыкаў і дыпломныя праекты студэнтаў. На пленарным пасяджэнні выступіў загадчык кафедры дызайну, член Саюза дызайнераў А.В. Чарнышоў з паведамленнем пра сучасны стан і перспектывы развіцця дызайну ў Беларусі, а таксама пра асаблівасці падрыхтоўкі будучых дызайнераў на гуманітарным факультэце.

**Іван ФЕДАРОВІЧ**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*У.Е. Снапкоўскі.* **Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. У 2 частках. Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст.** У другой частцы навучальнага дапаможніка асвятляюцца геапалітычнае становішча і дыпламатычная дзейнасць Беларусі — ад уваходжання беларускіх земель у склад Расійскай імперыі да перыяду станаўлення знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

*Е.Д. Карих, А.А. Афоненко.* **Оптоэлектроника.** Практыкум з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь змяшчае апісанне лабараторных работ па курсе оптаэлектронікі.

*П.С. Лопух.* **Гідрагеаграфія Беларусі.** У дапаможніку разглядаюцца гідраграфічныя асаблівасці водных аб'ектаў Беларусі, гісторыя іх фарміравання, заканамернасці размеркавання па тэрыторыі, гідралагічны рэжым і гаспадарчае выкарыстанне.

*В.Н. Киселев, Е.В. Матюшевская.* **Экология ели.** У манаграфіі даследуецца экалогія елкі еўрапейскай на тэрыторыі Беларусі, прааналізаваны прычыны масавага ўсыхання ельнікаў на мяжы XIX—XX стст.

*А.Н. Андреев.* **Теория литературы: личность, произведение, художественное творчество. В 2 ч. Ч. 1. Теория литературно-художественного произведения. Ч. 2. Теория художественного творчества.** У навучальным дапаможніку, дапушчаным Міністэрствам адукацыі, разглядаюцца найважнейшыя ўласцівасці мастацкіх твораў, асаблівасці мастацкага мыслення, даследуецца прырода асобы як суб'екта і аб'екта эстэтычных адносін. У другой частцы выдання ўскрываецца дыялектыка мастацкай свядомасці, даследуецца прырода творчасці.

*Г.Я. Рылюк, Я.К. Еловичева.* **Физическая география Мирового океана.** У навучальным дапаможніку разглядаюцца працэсы, якія адбы-




ваюцца ў Сусветным акіяне, гісторыя даследаванняў акіяна, асноўныя рысы рэльефу і геалагічная будова яго дна, клімат і водныя масы, дынамічны рэжым, арганічнае жыццё.

*Л.П. Воробьева, Т.Г. Давидович, Т.В. Лашук.* **Немецкий для математиков.** У дапаможнік уключаны аўтэнтычныя тэксты па асноўных раздзелах матэматыкі. Да тэкстаў дадаецца сістэма лексіка-граматычных заданняў і практыкаванняў. Ёсць таксама дадатковы даведачны матэрыял: спецыяльны слоўнік матэматычных тэрмінаў, табліцы і правілы чытання матэматычных сімвалаў і формул.

**Актуальные проблемы содержания и технологии обновления довузовского образования. Вып. 1.** Зборнік прысвячаецца 40-годдзю падрыхтоўкі замежных грамадзян і 35-годдзю даўніверсітэцкай адукацыі ў БДУ.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# АКЦЫЯ "РАДАСЦЬ ДЗЕЦЯМ"

***13—14 чэрвеня адбылася штогадовая акцыя "Радасць дзецям", арганізаваная актывам камітэта БРСМ БДУ. Студэнты наведалі дзіцячыя сады Мінска, гулялі з дзецьмі, рабілі ім падарункі і наладзілі тэатралізаваны паказ казкі.***



Упершыню такую акцыю праводзілі ў мінулым годзе. Тады ж было вырашана зрабіць яе штогадовай. Ініцыятыву камітэта БРСМ БДУ падтрымала адміністрацыя Маскоўскага раёна сталіцы, выдзеліўшы аўтатранспарт для акцыі. Актыў Саюза моладзі разам з прафесійнымі клоунамі і артыстамі наведалі дзіцячыя сады № 7, 85, 153, 172, 199 і 212.

Акцыя «Радасць дзецям» не адзіная з дабрачынных праграм, арганізаваных камітэтам БРСМ БДУ. Круглы год у 205-ы пакой галоўнага корпуса БДУ (кабінет маладзёжных арганізацый універсітэта) студэнты, супрацоўнікі і выкладчыкі БДУ прыносяць кнігі, гульні і самыя розныя падарункі, якія пад Новы год развозяцца па дзіцячых дамах Мінска і Мінскай вобласці. Самі ўдзельнікі кажуць, што для іх у такіх акцыях найлепшай узнагародай з'яўляюцца шчырыя дзіцячыя ўсмешкі.

**Аляксандр ЛЯНКЕВІЧ, сакратар камітэта БРСМ БДУ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ПЕРШЫЯ З ФДА

Першы сёлета выпуск замежных слухачоў факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ адбыўся 13 чэрвеня. Пасведчанні пра заканчэнне падрыхтоўчага аддзялення атрымалі 15 юнакоў і дзяўчат з Нігерыі, В'етнама, Кітая. Асаблівы гонар факультэта — выдатнікі вучобы Нгуен Тхі Ле Куен, Хаанг Тхі Бен, Ву Тхі Нгок Хоа (усе з В'етнама) і Сінь Чжыхуэй (Кітай): яны атрымалі граматы факультэта за поспехі ў навучанні. В'етнамскім дзяўчатам таксама ўручылі ўзнагароды як пераможцам алімпіяд факультэта па рускай мове, рускай літаратуры і краіназнаўстве.

Усяго сёлета на факультэце навучаліся 230 замежных грамадзян з 25 краінаў свету.

**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**



## У ПРАФКАМЕ

# АДПАЧЫЦЬ У "БРЫГАНЦІНЕ"

Правам на адпачынак і санаторна-курортнае лячэнне карыстаюцца не толькі студэнты, але і супрацоўнікі нашага універсітэта. Так, каб атрымаць пуцёўку ад Фонду сацыяльнай абароны, трэба прадаставіць у прафсаюзную арганізацыю даведку-пацвярджэнне ўрачэбнай камісіі пра неабходнасць аздараўлення, а таксама падаць заяву на выдзяленне індывідуальнай пуцёўкі. Аплата робіцца паводле тарыфнай сеткі ў залежнасці ад заработнай платы супрацоўніка. У сярэднім дабаўляць даводзіцца ад 20 % да 100 % кошту пуцёўкі: грошы ідуць у дзяржбюджэт. У бацькоў ёсць таксама магчымасць бясплатна падлячыць дзетак. Самых маленькіх могуць суправаджаць іх мамы.

Акрамя таго, дзяцей супрацоўнікаў на летнія вакацыі прымае лагер "Брыганціна": адбудуцца тры заезды па 18 дзён. А напрыканцы лета, у жніўні, "Брыганціна" адчыніць дзверы для дарослых: дзве змены па 12 дзён лагер будзе "належаць" выкладчыкам.

**Алена КРЫЎКІНА**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# РАЗМАЎЛЯЕМ ПА-ФРАНЦУЗСКУ

***Што ж такое франкафонія, і адкуль яна з'явілася на Беларусі? Пра гэта я запыталася ў выкладчыцы кафедры раманскага мовазнаўства, кіраўніка франкамоўнага тэатра Галіны Рыгораўны ПРАСНОВАЙ.***

Як высвятляецца, франкафонія — гэта культурная сукупнасць людзей ва ўсім свеце, зацікаўленых французскай культурнай спадчынай. Адным з асноўных прынцыпаў Міжнароднай арганізацыі франкафоніі, у якую ўваходзяць 49 дзяржаў, з'яўляецца менавіта культурнае ўзаемаўзбагачэнне. Ініцыятарам супольнасці стаў се-



негальскі пісьменнік Сен-Гор, які быў пазней абраны прэзідэнтам краіны.

Што датычыць Беларусі, то ў нас існуе Беларуская асацыяцыя выкладчыкаў французскай мовы, раз у год праводзіцца Франкафонны тыдзень. Адным з яго пастаянных удзельнікаў з'яўляецца франкамоўны тэатр Галіны Рыгораўны.

Нарадзілася тэатральная суполка ў 1994 г., калі яе "касцяк" яшчэ ў школку хадзіў. Але ж школа была не простая, а спецыялізаваная — з паглыбленым вывучэннем французскай мовы. Вучні пасталелі,ператварыліся ў студэнтаў, частка з іх патрапіла на філалагічны факультэт. З 1999 г. яны вярнуліся да колішняга захаплення, стварыўшы "філіял" тэатра.

На філалагічным факультэце, як вядома, "прапісаліся" яшчэ некалькі тэатральных аб'яднанняў ("На балконе", "На філфаку"), але ж "французы" не лічаць іх за канкурэнтаў. "У нас свая ніша, бо мы робім пастаноўкі на французскай мове, — кажа Галіна Рыгораўна. — Да таго ж, два нашыя артысты адначасова працуюць у іншых студэнцкіх трупах".

Кажуць, наяўнасць энтузіязму — палова запланаванай справы. З гэтым я вымушана пагадзіцца, таму што бачыла: музычнае агучванне, сцэнарыі студэнты робяць самі. Часам толькі сцэнічныя касцюмы пазычаюць у калег з тэатраў музычнай камедыі і юнага гледача.

Сярод школьных вучняў Галіны Рыгораўны ўжо ёсць першы значны "ўраджай". Малады акцёр Андрэй Баравы, які скончыў пасля франкамоўнай школы Інстытут культуры, зараз здымаецца ў фільмах, працуе рэжысёрам, удзельнічае ў комік-гурце "Доктар Гумар".

Французская мова і тэатральнае майстэрства дапамагае юным акцёрам і ў жыцці: яны становяцца больш камунікабельнымі, пашыраюць свае моўныя веды, усебакова развіваюцца. Не дзіва, што хлопцы і дзяўчаты займаюцца сваёй справай з вялікай цікаўнасцю і апантанасцю: атрымаўшы перамогу на Рэспубліканскім франкафонным фестывалі, яны маюць магчымасць паехаць на Міжнародны тэатральны фестываль у Авіньёне (Францыя).

**Алена КРЫЎКІНА**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

21 чэрвеня 2005 года
Падпісана да друку 21.06.2005 г.
Зак. 498. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by